Однако близость и синхронность этих процессов не означает их тождественность. Более детальный анализ по курсам позволяет увидеть и некоторые отличия:

- полная синхронизация, по-видимому, присуща лишь для формирования двух «ключевых» элементов профессионального ценностного сознания будущих специалистов («профессионализма» и «индивидуальной ответственности»);
- формирование представления (интериоризация) о значимости «непосредственного участия в социальном контроле», на наш взгляд, подвергается своеобразной коррекции в процессе адаптации на первом курсе, в результате которой поведение студентов становится более конформистским;
- снижение значимости «профессионализма» и «индивидуальной ответственности» к четвертому курсу вероятно обусловлено снижением уровня профессиональной мотивации, т.е. разочарованием некоторой части старшекурсников в избранной профессии, возможностях удачного трудоустройства и возможностях принятия на себя какой-то серьезной ответственности.

Судя по тому, что результаты близкие к этим неоднократно получались в социологических исследованиях студенческой молодежи как в советский, так и в постсоветский периоды, мы имеем дело с достаточно универсальным феноменом — ростом неопределенности в ранее сложившейся ценностно-мотивационной структуре личности в преддверии изменения ее социального статуса.

В целом, сравнение данных по вузам дает основание предположить, что они являются основной учебно-воспитательной системы, формирующей КОС. Можно предположить, что данный процесс протекает в тесной взаимосвязи с процессом формирования профессиональной культуры определенного типа (например, банковско-финансовой или менеджмента) на уровне факультетов вузов. Стилистические особенности технологий управления учебно-воспитательным процессом должны представлять собой баланс контрольных и развивающих функций, чтобы не подавлять креативность и инициативу при формировании КОС.

***С.В. Кротаў***
*БДЭУ (Мінск)*

## ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ ПАЛІТЫКА-ПРАВАВЫХ ІНСТЫТУТАЎ ЯК СРОДАК ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ МОЛАДЗІ

Даследаванне гісторыі такога найважнейшага інстытута як мясцовае самакіраванне вызвана неабходнасцю фарміравання высокага ўзроўню прававой і палітычнай культуры сучаснай моладзі, выхавання пачуцця павагі і гонару за сваю спадчыну, адказнасці за лёс дзяржавы.

З канца XIV стст. у гарадах і мястэчках ВКЛ фарміруецца якасна новая форма мясцовага самакіравання, атрымаўшая назву магдэбург-

скае права. Увогуле яно ўяўляла сабой сукупнасць прававых нормаў, якія рэгулявалі жыццядзейнасць гараджан і местачкоўцаў. Паводле прывелея на магдэбургскае права, гараджане вызваляліся з-пад улады ваявод, стараст і іншых асоб і атрымлівалі права мець уласныя органы гарадскога самакіравання.

Нельга абысці ўвагай сялянскае самакіраванне, якое ажыццяўлялася праз сялянскія сходы, на якіх размяркоўвалася даніна, разбіраліся спрэчныя справы паміж сялянамі, адбываліся выбары старэйшыны. Асобна трэба сказаць аб сялянскіх копных судах, якія дзейнічалі на падставе норм звычаёвага права.

Шляхецкае самакіраванне як інстытут улады з'яўлялася найбольш развітай і функцыянальнай, з існуючых у той час, сістэм самакіравання, якое ажыццяўлялася праз соймікі і сходы шляхты. Гісторыі вядомы шэсць відаў соймікаў: перадсоймавыя, рэляцыйныя, каптуровыя, дэпутацкія, элекцыйныя і гаспадарчыя. Кожны з соймікаў выконваў тую функцыю, для якой склікаўся. Але пры супадзенні тэрмінаў правядзення, што характэрна для дэпутацкіх, элекцыйных і гаспадарчых соймікаў, усе яны маглі трансфармавацца ў адзін, які вырашаў пытанні, характэрныя для ўсяго аб'яднання.

Менавіта скліканне перадсоймавых соймікаў стала першым і найбольш значным крокам мясцовай шляхты да ўдзелу ў кіраванні дзяржавай. Аналіз дзейнасці прадстаўнічага органа шляхты дае падставу казаць аб высокім узроўні і культуры шляхецкага самакіравання, што праяўлялася ў самастойным вырашэнні або непасрэдным удзеле ў вырашэнні пытанняў мясцовага і агульнадзяржаўнага значэння на карысць як сабе, так і ўсей дзяржаве.

Такім чынам, можна зрабіць выснову аб высокім якасным узроўні мясцовага самакіравання на Беларусі ў Сярэднявеччы, валоданні кожнай з яго падсістэм сваімі ўласнымі судовымі органамі, аддзеленымі ад адміністрацыі, самастойнасцю ў вырашэнні мясцовых пытанняў.

Патрыятычнае выхаванне моладзі на сенняшні дзень адна з прыярытэтных задач дзяржавы, але такое выхаванне магчыма толькі праз асвету і ўсебаковае развіццё асобы. Вывучэнне асноўных інстытутаў кіравання дзяржавай, гісторыі іх станаўлення і развіцця, у кантэксце гісторыі дзяржавы і ўвогуле сусветнай гісторыі, спрыяе ўсведамленню беларускай моладдзю сябе паўнапраўнай і арганічнай часткай міжнароднай супольнасці.

*С.У. Кухта*
*БДЭУ (Мінск)*

## ФАРМІРАВАННЕ СВЕТАПОГЛЯДУ АСОБЫ ПАД УПЛЫВАМ БЕЛАРУСКАГА СЛОВА

Вялікія палітычныя, сацыяльныя і эканамічныя пераўтварэнні шмат у чым абумовілі якасна новы падыход да асэнсавання навучальна-выхаваўчых задач, што стаяць сёння перад вышэйшай школай.